

*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

**Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна**

| №17(408) | Субота, 7 мая 1960 года | ЦЕНА 10 КОП. |
|---|---|---|



## РАБОТА АБ БЕЛАРУСКІМ КНІГАДРУКАВАННІ

УСЕСАЮЗНЫ закрыты агляд студэнцкіх навуковых работ у гэтым годзе праводзіўся ў Казані. Журы вельмі прынцыпова і патрабавальна падыходзіла да ацэнкі працы студэнтаў. Усяго было прысуджана 13 залатых медалёў. 6 з іх дасталося студэнтам універсітэтаў, а 7 — інстытутам. 12 з 13 залатых медалёў было прысуджана за працы ў галіне прыродазнаўчых і дакладных навук. За працы ў галіне грамадскіх навук быў прысуджаны толькі адзін залаты мядаль. Яго атрымаў студэнт 5 курса гістарычнага факультэта нашага універсітэта Георгі Галенчанка за працу «Беларускае кнігадрукаванне 16—18 стагоддзяў». Гэта вялікі і сур'ёзны поспех маладога даследчыка, які працаваў пад кіраўніцтвам выдатнага педагога Л. .С. Абэцэдарскага.

Работа «Беларускае кнігадрукаванне 16—18 стагоддзяў» напісана па першакрыніцах буйнейшых савецкіх бібліятэк, у прыватнасці, ленінградскай Бібліятэкі імя Салтыкова-Шчадрына і іншых. У ёй даследаваны і выдатна асветлены пытанні ўзнікнення і развіцця кірылаўскага кнігадрукавання, дзейнасць друкарань 16 стагоддзя, роля Скарыны, Буднага, Цяпінскга і іншых у справе беларускага кнігадрукавання. Дэталёва і дакладна разабрана пытанне аб друкарнях брацтваў і іх барацьба з каталіцкім засіллем на тэрыторыі Беларусі. Вялікае месца ў рабоце Галенчанкі займае праблема брацкіх сувязей усходнеславянскіх народаў і дзейнасць беларускіх друкароў на тэрыторыі сяброўскіх народаў, асвятленне дзейнасці Сімеона Полацкага, Ілы Ваніеўскага, Спірыдона Собаля.

Гэоргі Галенчанка прыводзіць вялікі фактычны і дакументальны матэрыял, які паказвае значэнне беларускага кнігадрукавання у барацьбе за нацыянальную незалежнасць Беларусі. Праца Галенчанкі мае вялікую каштоўнасць і ў тых адносінах, што гэта першая работа ў гістарычнай літаратуры па гэтаму пытанню. У ёй выкарыстаны ўсе навейшыя матэрыялы, абапіраючыся на якія аўтар з правільных маркеісцка-ленінскіх пазіцый даследуе нераспрацаваную да гэтага часу тэму.

**Э. ДУБІНСКІ.**



## *Сваточныя віншаванні*

**У сувязі са святкаваннем 1-га Мая ў адрас нашага універсітэта паступілі віншаванні ад Чарнавіцкага, Латвійскага, Кіеўскага, Вільнюскага, Варонежскага, Харкаўскага, Іркуцкага універсітэтаў, а таксама ад калектыва Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі і іншых ВНУ краіны.**





**Універсітэт на першамайскай дэманстрацыі.**

## Яны робяць нашу газету

Кнігадрукаванне адкрыта даўно. І ўсё ж многіх цікавіць, хто і як іменна робіць нашу газету. Коратка раскажам пра гэта.



Валя Гайваронская — адна з лінатыпістак. Гэта другі (пасля машыністкі) чытач газеты. Ды і праца яе нагадвае працу першай. Толькі друкуе Валя не на паперы, а на метале. Лёгка бегаюць яе пальцы па клавіятуры лінатыпа, і машына выкідвае бліскучыя металічныя радкі. Намаж такі радок чорнай друкарскай фарбай, прыцісні да паперы — і на ей адаб'ецца газетны радок. Набіраць газету цяжэй, чым кнігу. Меняюцца і шрыфты, і фарматы. Бывае, што ні заметка — дык іначай набіраць трэба. І ўсё ж Валя любіць газету. Калі рукапісы паступаюць у яе змену, можна быць упэўненым — газета будзе набрана своечасова.

ЛЕПШЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

## КНІГА ПАРАДКУ

*Пры ўваходзе ў наш інтэрнат на стале ў дзяжурнага ляжыць некалькі вялікіх канторскіх кніг у брудных зашмальцаваных вокладках. Гэтыя кнігі носяць гучныя назвы: «Кніга прыёму і здачы дзяжурстваў», «Кніга для запісу няспраўнасцей». Адзін іх знешні выгляд чаго варты, але тое, што напісана ў іх—не паддаецца апісанню.*

*Вось, напрыклад, «Кніга для запісу няспраўнасцей». І чаго тут толькі няма! Побач з просьбай адрамантаваць рэпрадуктар у ультыматыўнай форме прад'яўляецца патрабаванне аб'явіць вайну мышам, апанаваўшым жыхароў 48 пакою. Вось сінімі чарніламі запісаны своеасаблівы «SOS»: «Устаўце неадкладна акно ў 52 пакоі. Замярзаем.» і алоўкам дабаўлена: «Няхай замярзаюць».*

*Як ні дзіўна, але іменна гэта кніга ўздоўж і ўпоперак спісана просьбамі разбудзіць той або іншы пакой у такі-то час. Тут практыкуюцца ў сваёй дасціпнасці вастракі-самавучкі. Плоскія астроты напаўняюць і другія кнігі. «Кніга для запісу наведвальнікаў» да таго брудная, што страшна гартаць яе. На ей спрабуюць руку «мастакі». Пачварныя галовы з разнастайнейшымі прыпіскамі сустракаюцца на кожнай старонцы.*

*У дадатак да ўсяго кнігі зусім пашматаваны. Лахманы лістоў тарчаць ва ўсе бакі. Алфавітны ўказчык настолькі парваны, што там зусім цяжка прачытаць чыё-небудзь прозвішча.*

*І міма ўсяго гэтага раўнадушна праходзяць і камендант, і члены студсавета. Як відаць, гэтыя кнігі нікім не правяраюцца. А трэба было б! Мне здаецца, патрэбна чым хутчэй выкінуць гэта рванне і завесці новыя кнігі.*

*Акрамя гэтага патрэбна абавязаць усіх дзяжурных утрымліваць кнігі ў парадку, а членам студсавета і каменданту інтэрната сістэматычна правяраць іх.*

*(«Рашым любую задачу»)*

# ВАСТРЭЙШАЯ ЗБРОЯ ПАРТЫІ

Кожны дзень выходзяць з друку дзесяткі мільёнаў экземпляраў савецкіх газет. Цягнікі, самалёты, параходы, верталёты дастаўляюць іх чытачам ва ўсе куткі нашай неабсяжнай краіны. У нашым савецкім друку, які прадаўжае слаўныя традыцыі ленінскай «Праўды», рабочыя, сяляне, людзі разумовай працы знаходзяць свайго дарадчыка, настаўніка, сябру. Друкаванае слова, гэта найвялікшае дасягненне чалавечага генія, стала ў нашай краіне магутнай ідэйнай зброяй партыі ў барацьбе за перамогу камунізма.

Выдатныя заслугі савецкага друку перад партыяй і народам былі высока ацэнены ў прывітанні ЦК КПСС першаму Усесаюзнаму з'езду савецкіх журналістаў: «У нашай краіне друк стаў неад'емнай часткай духоўнага жыцця народа, а савецкая журналістыка—важнейшай галіной партыйнай і грамадскай дзейнасці. Камуністычная партыя высока цэніць высокародную працу савецкіх журналістаў — работнікаў газет і часопісаў, радыё і тэлебачання, выдавецтваў і органаў інфармацыі, якія іграюць важную ролю ў гістарычнай справе будаўніцтва камуністычнага грамадства, у выхаванні новага чалавека і ў барацьбе за мір ва усім свеце».

Разам з вялікімі і малымі друкаванымі органамі важную ролю ў барацьбе за выкананне гэтых задач адыгрываюць газеты, якія выдаюцца на кожным савецкім прадпрыемстве, у кожнай установе і арганізацыі.

Днямі былі падведзены вынікі гарадскога агляду насценгазет ВНУ, і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў Мінска. Першае месца і першая прэмія адзінадушна прысуджаны насценнай газеце біялагічнага факультэта «За мічурынскую біялогію». Яна вылучаецца сярод іншых газет як багаццем зместу, так і высокай культурай афармлення.

У чым сакрэт поспеху рэдкалегіі газеты «За мічурынскую біялогію»? У тым, што кожны член рэдкалегіі адчувае высокую адказнасць за даручаную яму справу і любіць яе.

Гэтага нельга сказаць, на жаль, аб фізічным факультэце. Днямі партыйны камітэт разглядзеў пытанне аб кіраўніцтве партбюро фізфака насценным друкам і адзначыў, што партбюро дрэнна кіруе сваім друкаваным органам. Гэта прывяло да таго, што рэдкалегія, абраная ў колькасці 12 чалавек, па сутнасці распалася. Газета дрэнна асвятляе жыццё партыйнай арганізацыі факультэта, мала ўдзяляе ўвагі пытанням вучобы. Дрэнна вядуцца сатырычныя аддзелы газеты «Пыласос» і «Смяхач». Часта іх крытычныя выступленні бываюць беспрадметнымі з налётам зубаскальства і пошласці.

Вопыт работы рэдкалегіі «За мічурынскую біялогію» сведчыць аб тым, што мы можам зрабіць усе факультэцкія газеты яркімі і змястоўнымі. Партыйным бюро, камсамольскім і прафсаюзным бюро факультэтаў неабходна толькі ўдзяляць больш увагі рабоце рэдкалегій, дапамагаць ім, дабівацца дзейнасці крытычных выступленняў.

Сёння ў нумары друкуецца шэраг матэрыялаў з насценных газет і аб насценных газетах. Многія важныя пытанні ўзнімаліся ў нашым малым друку. Хіба не чытаецца з цікавасцю нумар газеты «Рашым любую задачу», прысвечаны рацыянальнаму выкарыстанню часу. Матэматыкі знайшлі цікавыя формы падачы матэрыялу, арыгінальную «шапку»: «60×60×24=68400. Как твой товарищ использует их». І як шкада, што гэтыя матэрыялы не чыталі студэнты іншых факультэтаў.

Рэдкалегіям насценных газет патрэбна трыбуна для абмену вопытам — з гэтым згодны ўсе. На жаль, пакуль што мала хто падтрымаў ініцыятыву біёлагаў — лепшыя матэрыялы аддаваць на суд грамадскасці універсітэтія праз нашу шматтыражку.

Рэдакцыя «Беларускага універсітэта» згодна час ад часу прадставіць свае старонкі для палос, падрыхтаваных насценнымі газетамі. Тут можна знайсці і дапамогу і павучыцца літаратурнай працы. Дык за вамі слова, таварышы! Давайце сябраваць, цесна супрацоўнічаць. Нашы чытачы ад гэтага толькі выйграюць!..

## ЯНЫ РОБЯЦЬ НАШУ ГАЗЕТУ



Станіслаў Сушынскі — вярстальшчык і выпускаючы адначасова. Гэта ён складае металічныя радкі так, каб з іх атрымалася заметка, падбірае загалоўкі, лінейкі, робіць рамкі, аборкі. Ад яго ў многім залежыць знешні выгляд газеты.

# Аб самым галоўным

Напісаць аб нашай рэдкалегіі? Аб гэтым можна пісаць гадзіну — 3 гадзіны—дзень, але пастараемся напісаць асноўнае за 15 хвілін. А асноўнае калектыў.

Стабільны састаў рэдкалегіі—13 чалавек—«чортаў тузін», але тузін гэты, на наш погляд, вельмі дружны. Большасць пяцікурснікі. І наша упушчэнне, што пакуль мала студэнтаў малодшых курсаў.

У нас любяць сабрацца разам не толькі ва універсітэце для выпуска газеты, але і дома, у інтэрнаце, паспрачацца аб тым, хто выйграе, Таль або Батвіннік, абмяняцца кнігамі, думкамі аб пісьменніках, вучоных, пагутарыць аб музыцы, спорце, з'ездзіць у госці да вясенняга лесу. Культпаходы у нас—не рэдкі выпадак, а законная з'ява, і вынікам кожнай стыпендыі з'яўляецца або калектыўнае праслухоўванне сімфанічнай музыкі, або прагляд новага фільма і абавязкова новыя кнігі. Мы не памылімся, калі пачнем сцвярджаць, што самыя гарачыя кнігалюбы—члены рэдкалегіі. А наш Коля Гесь! Ён бесперапынна забяспечвае нас кнігамі, у большасці яны былі аб прыродзе. Колю многія члены рэдкалегіі абавязаны «безнадзейнай» любоўю да паэзіі.

І наогул, цяжка сабе прадставіць газету без Колі Геся, Надзі Батурыцкай, Тамары Лебедзявай, Розы Ганчаровай, Тамары Міхеевай, без нашага нязменнага фотакарэспандэнта Лёні Папковіча.

Цяпер канкрэтна аб рабоце. У нас няма ні асобнага памяшкання, няма і сваёй машынкі. Па гэтых прычынах часта прыходзіцца чухаць пятыліцы і бегаць па этажах у пошуках адносна свабоднай плошчы або машынкі, якая бывае занятай іменна тады, калі патрэбна, і «Прагрэс» (мы яе ахрысцілі «Рэгрэсарам») з інтэрвалам 1—2 прыходзіцца мяняць у працэсе работы на другую машынку з лентай, менш выкарыстанай. чым першая. Вынік—розная плотнасць і чысціня. Дні і гадзіны выпуску устанаўліваем самі. Планіроўка праводзіцца на некалькі нумароў уперад. І пакуль амаль увесь матэрыял не збярэм, не прыступім да выпуску (навучыліся на вопыце).

У мінулым годзе рашылі выпускаць газету большым фарматам і 2 разы ў месяц. І трэба прызнацца, што гэта вялікая, «як працiна», газета не заўсёды змяшчае увесь матэрыял, хаця друкуем праз 1—1,5 інтэрвалы.

Газета разбіваецца на больш і менш важныя ўчасткі. Ёсць падвал (ганаровы), ёсць задворкі, цэнтр і г. д. Адпаведна па ступені важнасці размяшчаем матэрыял. Матэрыялы пад аднолькавымі рубрыкамі імкнемся змяшчаць на адным і тым жа месцы.

Амаль усе матэрыялы ў нас пад рубрыкамі. Сярод іх: «на кафедрах, у лабараторыях, і гуртках», «Біязнамянальныя даты» «Вецер вандраванняў і дым падарожжаў» і іншыя.

Мы імкнемся пазбягаць стандартных сухіх перадавіц, любім сатырычны і важны матэрыял падаваць жыва і цікава, і некаторыя з гэтага робяць вывад аб недастатковай сур'ёзнасці газеты.

Выходзяць у нас і тэматычныя нумары. У гэтым годзе мы больш месца ў газеце адводзім біёлагам. І мы не засмучаемся, што некаторым чытачам другіх факультэтаў матэрыялы нумара «30 і 3 адказы» паказаліся не цікавымі. Нашы ж студэнты лічаць яго адным з лепшых нумароў, які прынёс вельмі вялікую карысць.

Газетнаму мастацтву вучымся мы ў саюзным друку. У нас ёсць свае любімыя газеты («Комсомольская правда», «Литературная газета» і любімыя карэспандэнты Васіль Лескоў, Уладзімір Лідзін, Анатоль Прыстаўкін і іншыя. З некаторымі з іх у нас завязалася сяброўская перапіска.

Але самае галоўнае—мы вельмі любім сваю газету. Гэта, відаць, асноўная прычына яе папулярнасці.

**Н. РЫБІНА,**
**рэдактар газеты**
**«За мічурынскаю біялогію»**

## Вельмі добры нумар

*Я не збіраюся падрабязна аналізаваць усе вартасці і недахопы газеты «Рашым любую задачу». Хачу толькі сказаць, што чытаю я яе заўсёды з прыемнасцю, а навагодні нумар мне асабліва спадабаўся. Спадабаўся сваім гумарам, высокай літаратурнай якасцю матэрыялаў. Сярод іх цяжка нават назваць лепшыя. Матэматыкі вельмі ўдала спарадзіравалі многіх паэтаў і пісьменнікаў. «Уявіце сабе, — піша газета,— што на наш навагодні бал-маскарад прыйшлі вядомыя паэты і пісьменнікі. Вось што б яны сказалі». І далей падаюцца вельмі дасціпныя пароды, што цяжка ўтрымацца, каб не прывесці пару з іх. Напрыклад, на думку рэдкалегіі, Пушкін, пабываўшы на матфаку, сказаў бы:*

*Здесь обучают очень строго,*
*Не как и не чему-нибудь.*
*И эрудицией, ей богу,*
*Здесь очень мудренно*
*блеснуть.*

*Па-іншаму гаворыць Маякоўскі:*

*Я пока сюда дошёл,*
*Слышал много вздохов:*
*«Сдал экзамен—хорошо,*
*Провалился—плохо».*

*Цікава напісаны таксама матэрыял «Хто гэта робіць» (Аб надпісах на сталах).*

*Праўда, можна было б паспрачацца аб заметцы «5 мінут». Але і яна чытаецца вельмі лёгка.*

**В. ШЭІН.**

## Вечар выпускнікоў

Больш ста чалавек з'ехалася на традыцыйны вечар выпускнікоў геафака. Перад сабраўшыміся з прамовамі выступілі т.т. Дзяменцьеў, Шкляр, Рагозін. Супрацоўнікі Акадэміі сельскагаспадарчых навук т. Русінаў у сваёй прамове прапанаваў даваць будучым географам больш сельскагаспадарчых ведаў. Т. Бондар, заслужаны настаўнік БССР, завуч 9 школы г. Мінска, падкрэсліў неабходнасць палепшыць метадычную падрыхтоўку выпускнікоў факультэта. Настаўнік з Пліскага раёна т. Казёл сказаў, што многім выпускнікам напэўна прыдзецца весці на месцы будучай працы вялікую агітацыйную работу і што да гэтага рыхтавацца трэба загадзя, у сценах універсітэта.

ЛЕПШЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

## Галінка бэзу

*(Маленькая навела)*

*На маім стале ў вазе стаіць галінка бэзу.*

*З акна праз стрэхі суседніх хат я бачу іржавыя прагаліны за горадам, голыя маркотныя схілы, нават снег на верхавінах дрэў у самым горадзе, а ў пакоі ў мяне вясна.*

*Мой таварыш жыве ў даліне, на кіламетр ніжэй мяне, вясна да яго прыходзіць на добрых дзесяць дзён раней, і кожны год ён з зухаватасці прыносіць мне ў горы кавалачак сваёй вясны. Я ўдзячны гэтай яго зухаватасці, рады каштоўнаму падарунку, у маім доме таварыш, які прыносіць бэз з даліны — самы дарагі госць. Усе ведаюць нядоўгае жыццё бэзу ў пакоі. Дзень, другі пакрасуецца ён у вазе, шчадра надзяляючы людзей водырам і свежасцю, а там глядзіш, закрыліся вочкі маленькіх кветачак, пацямнелі, завялі лісточкі. І як не шкада бэзу, па трэбна асцярожна, каб не асыпаліся на падлогу высахшыя кветкі, вынесці яго з пакою.*

*Але я не спяшаюся гэта рабіць. Я ведаю адну хітрыку: калі зноўку падрэзаць галінку і апусціць яе ў гарачую ваду— бэз зноў расквітнее. Я раблю гэта і бэз ажывае. Праўда не надоўга. Успыхне і згарыць.*

*За маім вакном уецца сарэбраная кудзеля — пух таполя і адуванчыкаў засыпае белымі пушынкамі дахі дамоў, тратуары, алеі сквераў. Вясна прыйшла і да нас. Цяпер няцяжка і самому дастаць свежы бэз, але я па-ранейшаму верны сабе: раней тэрміну не выношу з пакою засыхаючыя галінкі.*

*Вось і сёння я бяру галінку асыпаючагася бэзу, падразаю яе і апускаю ў кіпяток.*

*Няхай згарае мой бэз, не ведаючы старасці.*

**Леанід ГУРУНЦ.**

**(«За мічурынскую біялогію»)**

* Навела напісана па просьбе рэдакцыі газеты «За мічурынскую біялогію».

## Яны робяць нашу газету



**Апошняе, рашаючае слова — за друкаром Анатолем Пількевічам. Анатоль сцвярджае, што нават папяросная паперка, падкладзеная пад кліша, вельмі многа значыць для чоткасці і выразнасці здымка. І трэба прызнаць, прыпраўку ён робіць па-майстэрску. І калі знешні выгляд нашай газеты значна палепшыўся ў параўнанні з мінулым — у гэтым немалая заслуга Анатоля Пількевіча.**

★ ★

НА ГЭТАЙ СТАРОНЦЫ:

У НАС У ГАСЦЯХ

*НАСЦЕННАЯ ГАЗЕТА*

**„СОВЕТСКИЙ ЮРИСТ"**

★ ★

*ТРЫБУНА ГРУПОРГА*

# Гэта прыносіць карысць

*Агульнавядома, што паспяховая работа студэнтаў на працягу вучэбнага года залежыць ад пастаноўкі ўсей масава-выхаваўчай работы на кожным курсе. Цяпер, у сувязі з перабудовай структуры камсамольскіх арганізацый ВНУ, асноўная арганізацыйная і масава-палітычная работа перайшла непасрэдна ў групы.*

*У складзе групы, якая абрала мяне групоргам, 26 чалавек. Большасць студэнтаў прымаюць актыўны удзел у грамадскім жыцці факультэта і універсітэта. 8 з іх з'яўляюцца членамі народнай дружыны, многія прымаюць удзел у рабоце розных гурткоў і секцый. Князюк і Васілевіч займаюцца ў лёгкаатлетычнай секцыі, Лукашэвіч — у гімнастычнай, Балыкава і Зінгілеўская — у валейбольнай, Барбарчык захапляецца барацьбой.*

*Важным сродкам прыцягнення студэнтаў да ўдзелу ва ўсіх мерапрыемствах, якія праводзяцца на факультэце, з'яўляюцца арганізацыя і правядзенне групамі экскурсій на прадпрыемствы сталіцы, культпаходаў у музеі, тэатры. Гэта ў значнай меры згуртоўвае калектыў у адзіную сям'ю. Студэнты нашай групы зрабілі культпаходы ў мастацкі музей, на Мінскі гадзіннікавы завод, калектыўна прагледзелі шэраг мастацкіх фільмаў. Петр Седач зрабіў для сваіх таварышоў цікавы даклад аб дружбе, таварыстве і каханні.*

*Мне здаецца, што ў кожнага групорга павінен быць канкрэтны план правядзення культурна-масавай работы. І многае ў камсамольскай рабоце залежыць ад таго, як гэты план будзе ажыццяўляцца на справе.*

**А. ПАШКОЎ,**
**групорг II групы, II-га курса.**

# НАША АГУЛЬНАЯ СПРАВА

Наўрад ці стане хто-небудзь пярэчыць супраць агульнавядомага паняцця, што чысціня — залог здароўя. Але не кожны з нас захоўвае і змагаецца за яе. У гэтым не цяжка пераканацца, калі прайсціся па вучэбных аўдыторыях нашага корпуса.

Уведзенае ў наш быт самаабслугоўванне павінна было прынесці чысціню і парадак у нашы аўдыторыі, змяніць адносіны студэнтаў да працы тэхнічнага персаналу. Вопыт некалькіх месяцаў паказвае, калі што змянілася ў лепшы бок, дык вельмі мала.

Абыякавыя адносіны студэнтаў да працы свайго ж таварыша асабліва ярка відаць, калі праходзіць уборка вучэбных памяшканняў. Цэлыя горы смецця — парванай на кавалачкі паперы, пакамечаных запісак, абрыўкаў газет, лістоў з сшыткаў, кускоў пакрышанай крэйды — чаго толькі не пакідаюць пасля сябе некаторыя дзялкі! І так з дня у дзень...

Узнікае пытанне, няўжо смецце — гэта неабходны прадукт вучэбнага працэсу? Няўжо без яго нельга абыйсціся? Чаму б не стварыць абстаноўку, пры якой падобныя парушэнні элементарнай культуры сталі б немагчымымі?

Калі кожны з нас будзе захоўваць чысціню і сам глядзець за тым, як выконвае гэта таварыш; калі, нарэшце, мы наладзім паўсядзённыя дзяжурствы на лекцыях і семінарах — мы несумненна даб'емся поспеху. Праца дзяжурнага ператворыцца з «цяжкага абавязку» у просты нагляд за парадкам. А вучоба, работа усіх студэнтаў стане лягчэйшай, больш прыемнай і вясёлай. Трэба адкінуць неразумную практыку ўборкі памяшканняў перад заняткамі. Сам насмяціў — сам прыбяры, а не спадзявайся на другога — вось што павінна стаць нашым дэвізам.

Барацьба за чысціню нашых аўдыторый, барацьба за культуру студэнцкага быту — гэта справа не толькі камсамола, прафсаюза або якой-небудзь другой арганізацыі—гэта наша агульная справа, таварышы, і толькі ад нас залежыць яе поспех.

**А. МІХАЙЛАЎ,**
**студэнт III курса.**



**НА** трэцім курсе пачаліся практычныя заняткі па крыміналістыцы. У бягучым годзе яны прысвечаны судзебнай фатаграфіі. Вучэбны план мае сваёй мэтай дабіцца, каб кожны студэнт дасканала ведаў усе фатаграфічныя працэсы.

Веданне фотасправы неабходна не толькі следчаму, але і любому практычнаму работніку органаў суда і пракуратуры. Большасць студэнтаў вельмі добра разумеюць, што тэарэтычныя веды не заменяць ім практычныя навыкі і таму з асаблівай сур'ёзнасцю адносяца да кожнага часу заняткаў.

Студэнты Мікалай Скарабагатаў, Павел Герасімчык, Генадзь Чарнышэвіч нават наладжваюць самі сабе дадатковыя заняткі ў лабараторыі ў выхадныя дні. Яны імкнуцца хутчэй асвоіць усе таямніцы фатаграфічнага працэсу.

**Л. СЯНЮТА.**

★

**НА ЗДЫМКУ уверсе: студэнты на занятках па фотасправе.**

# У СЯМІ НЯНЕК...

Вынікі універсітэцкага агляду мастацкай самадзейнасці аказаліся для нас больш чым сумнымі. Дык давайце паспрабуем разабрацца ў прычынах няўдачы. Адказ можа быць толькі адзін—выключна дрэнная арганізацыя мастацкай самадзейнасці.

У мінулым годзе намаганнямі бюро камсамола і прафкома факультэта былі створаны харавы, драматычны і танцавальны гурткі, рэгулярна займаліся салісты-вакалісты, дэкламатары. І вынік сказаўся—наш факультэт цвёрда заняў I месца. Сёлета ні камсамольскае, ні прафсаюзнае бюро факультэта не звярталі ўвагі на самадзейнасць. Адказных было многа — Васілеўскі, Іванцова, Гуляева—але яны не змаглі нават арганізаваць хор.

На юрфаку працуе выкладчык Л. Я. Астроўскі. На мінулым аглядзе наш драмгурток, якім ён кіраваў, быў на галаву вышэй астатніх калектываў. Варта было правесці нязначную арганізацыйную работу — і гурток аднавіў бы сваю дзейнасць. Але і аб гэтым ніхто не паклапаціўся.

Рэпетыцыі танцавальнага калектыву праходзілі ад выпадку да выпадку. Гэта прывяло да таго, што на аглядзе нашы танцоры поўнасцю паўтарылі мінулагоднюю праграму.

Так атрымалася, што наша самадзейнасць — дзіця многіх нянек — страціла першае месца. Няхай жа гэты суровы урок пойдзе нам на карысць.

**В. ЗАРАГАЦКІ.**

# ДОБРЫЯ ВЕСТКІ

*АБАРОНА курсавых работ па тэорыі дзяржавы і права паспяхова пайшла на першым курсе. Большасць студэнтаў напісалі работу на «добра» і «выдатна». Вышэйшым балам адзначаны работы А. Знаешава, В. Давыдкі, А. Сілкіна, В. Сурмы і іншых.*

**І. СЕРГІЕНКА.**

*НЯДРЭННА папрацавалі на падрыхтоўцы да здачы ў эксплуатацыю новага інтэрната студэнты П. Герасімчык, Н. Зіневіч, А. Арэхаўскі, Л. Дубініна, М. Сцільба.*

*Напярэдадні Першага мая студэнты факультэта справілі наваселле.*

**Э. ВАЛЮКЕВІЧ.**



**Жыхары пакою № 19 Бацяноўскі, Шыханцоў, Семяновіч, Мароз, Сарачынскі рыхтуюцца да заняткаў.**



Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31; тэл. 2-07-19. Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.
АТ 06903. Зак. 916. Тыраж 2000 экз. Друкарня выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна.